Мікола Касьцюкевіч



..табой захаплёнаму,
з іншай бываць –
як каменем з дрэва
агонь выбіваць.....

# Яшчэ жывая Песьня...

## НАСТРОЙ

Нахмурыцца вечар і зваліць
паўзмрок ля глухіх ліхтароў
і на каляровыя палі,
што шыбы на дол
пратапталі,
начны прылятае арол.
Драбнютка крышу адзіноту,
сумненьні зьліваю ў кіліх
і госьця частую,
а потым
пяро выдзіраю
наўпотай
для сумных
натхненьняў сваіх.

## АПОШНІ ВЕЧАР

У змове з ветрам мылі хвалі
празрыстай пенай далягляд,
і птушка-мара наўздагад
нясьмелай песьняй працінала
няўцямнасьць лёсаў нам і сны.
Ды мы, стамлёныя, не адчувалі
што, пэўна, хутка дагарым…
Што дыхае таемным жалем
вада,
ў якую падмяшалі
душы птушынае
ультрамарын.

## ЗЛЫЯ ГОСЬЦІ

З вініла хрыплага ў паперы
настрой ляціць каціным ценем,
пакуль ня выявяцца цэны
на рыфмы, рытмы і памеры.

Воск у падсьвечнік сьцёк і зьліпся,
нібыта рожкі і капыты.
На пляме кавы недапітай
варожыць Муза тонкім кіпцем.

Перамаўляліся і зьбеглі
з маім натхненьнем злыя госьці,
і я разгублены ад злосьці
зноў сон засільваю нягегла.

## ІНСАЙТ

Кроплі радасьці з веек страсу
і ў палёце п’янкога сугучча
цалавацьму начную расу,
што лягла,
бы пярсьцёнак заручны,
на танюсенькі палец травы.

Адштурхнуся ад хісткага дна
асьляпляючага летуценьня,
усплыву, азірнуся – і знаць
буду пэўна, чые ж гэта цені

нерухомеюць ля галавы,
як адчуюць,
што я нежывы.

## СПЛІН

З табой мы блізкія настолькі,
што толькі бой настоль-
нага гадзіньніка
не дазваляе нам зьнікаць
са сцэны высьненага
існаваньня,
дзе ў чаргаваньні
выдуманых дзён
відзён заўсёдны
далягляд жаданьня:
каб з занатаванай
у скон ці-
шы
працерушы-
лася
сьлязінкай сонца,
яшчэ няздольнага
што вымаўляць
абрысы соннага,
другога,
пасьля ўжо
страчанага
немаўля...

## ІМПРЭСІЯ

Крывёй запульсуе сьвятло сьветлафора,
пасьля паспрабуе смарагд працадзіць,
і шпацыру за перапынак дасьць фору
бардзюр, акраплёны загадам «ідзі».

Дарэшты памкненьне прарвецца і горад,
узьняўшы намер над памерам двара,
разьвяжа адлегласьцю рух, а прастора
стос крокаў рассыпаных будзе зьбіраць.

*P.S.* І горда сьцішацьме гарбаценькі брук
ківач пары ног,
пары рук.

## КРАЯВІД

Варона на беразе, як інквізітар,
закручвае каструбаваты шнурок
крыкліваму ветру на горла. Ставок,
наведаўшы з неафіцыйным візітам,
гайдаецца сонца лянівы плавок.

А там, паглядзі, незлічоныя гмахі,
груваства ўсплываючы паміж бароў,
хапаюць паверхняй паветра, прапахлае
спалохам жывёлаў, пачуўшых, як тахкае
у іх пад нагамі пражылка метро.

За праўду сьвятла, пакаранае сьмерцю,
чапляецца сонца за ніцае вецьце,
ды з чорнай вады залатую карону
ужо не дастанеш. Разгублены вецер
скруціўся ля ног нерухомай вароны.

## ЖАРТ

Рыўкамі пазнаньня цыруючы сьвет,
усьлед за паскораным роварам веку
свой нос задзірае да ўзроўню сусьвет-
нага, але ня вышай ілба чалавек.
І нават ня петрыць, калі ў тэлескоп
старанна вынюхвае подых сусьвету,
што ў вочы ягоныя проста пад лоб
сусьвет узіраецца з пэўным імпэтам
для нейкай сваёй невядомае мэты.

* * *

Табой захаплёнаму,
з іншай бываць –
як каменем з дрэва
агонь выбіваць.
Каханьнем жыцьцё маё
не перайначана,
хаця камяні
і бывалі гарачымі.

* * *

*І семем было мне слова…*
Анатоль Сыс

Захварэла душа і гавее,
не спасьцігнуўшы мудрасьці Слова,
і цякуць запалёна з-пад веек,
нібы сьлёзы, цяжкія высновы.
У сьвятыні жывой яшчэ мовы —
занядбанай і ўсё-ткі найлепшай,
зноў і зноў на паперы гумовай
я вылушчваю з семені словаў
легкавейныя плевелы вершаў.

*1991*

* * *

Узьнёслы зорны сейбіт
таемнасьцю загушкаў,
і прагны позірк неба
выцягвае падушку
з пад галавы
з пяшчотай
забытай сынам маці.
...адкуль узяўся
клопат
сябе ў начы шукаць?

* * *

Я адчуваю часу смак,
таму й сачу яго няўзнак.

Каб небыцьцё ішло на злом,
дае цяпло бацькоўскі дом.

Трываюць з даўняе пары
любоў, каханьне і сябры.

І з рук маіх, як знаць куды,
нібыта птушкі, мкнуць гады.